**ФАРМІРАВАННЕ ПРАВАПІСНЫХ НАВЫКАЎ СЛОЎНІКАВЫХ СЛОЎ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ**

***Рубіс Г.С.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Васюковіч Л.С., доктар пед. навук, прафесар*

Ключавыя словы. Слоўнікавыя словы, арфаграфічныя навыкі, навучанне правапісу, метады і прыёмы навучання правапісу, арфаграфічны слоўнік.

Keywords. Vocabulary words, spelling skills, teaching correct spelling, methods and techniques for teaching spelling, spelling dictionary.

Фарміраванне граматнага пісьма застаецца адной з дыдактычных праблем сучаснай пачатковай адукацыі. Асаблівую складанасць і запатрабаванасць уяўляе засваенне значэння і правапісу слоўнікавых слоў, якія не падпарадкоўваюцца арфаграфічным правілам і патрабуюць запамінання. У сувязі з гэтым пошук і рэалізацыя эфектыўных метадаў і прыёмаў навучання слоўнікавым словам на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выступае актуальнай задачай.

Засваенне слоўнікавых слоў – істотная частка фарміравання пісьмовага маўлення. Для іх эфектыўнага запамінання выкарыстоўваюцца розныя метады: зрокавае ўспрыманне, мнеманічныя прыёмы, асацыяцыі і рэгулярнае паўтарэнне. Падрыхтоўка інтэрактыўных матэрыялаў са словамі, выкарыстанне іх у кантэксце сказаў, а таксама разнастайныя гульні і дыктоўкі – усё гэта дапамагае замацаваць правільнае напісанне [1, с. 51]. Гульнявыя формы працы – такія, як крыжаванкі, віктарыны і лінгвістычныя гульні, робяць працэс навучання запамінальным, сутнасным і займальным. Яны дазваляюць актывізаваць інтэлектуальную дзейнасць, "павысіць цікавасць да вывучэння мовы і стварыць станоўчы эмацыйны настрой" [2, с. 55].

Мэта даследавання – асэнсаваць на тэарэтычным узроўні і рэалізаваць практычна на этапе педагагічнага эксперымента методыку фарміравання правапісу і засваення слоўнікавых слоў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Матэрыял і метады**. Даследаванне праводзілася на базе ДУА «Гімназія №5 г. Віцебска імя І. І. Люднікава». У педагагічным эксперыменце прымалі ўдзел навучэнцы 4 класаў. Метады даследавання – аналіз навукова-метадычнай літаратуры па тэме, педагагічнае назіранне, сістэматызацыя інфармацыі, педагагічны эксперымент.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У вопытна-эксперыментальную частку нашага даследавання ўваходзілі наступныя этапы:

1. Канстатуючы эксперымент ставіў за мэту выяўленне ўзроўню сфарміраванасці навыку правапісу слоўнікавых слоў у навучэнцаў 4-х класаў.

2. Фарміруючы эксперымент накіроўваўся на распрацоўку і арганізацыю сістэмнай, неэпізадычнай працы па фарміраванні арфаграфічных навыкаў.

3. Кантрольны эксперымент ставіў за мэту апрацоўку і інтэрпрэтацыю эксперыментальных дадзеных, правядзенне параўнальнага аналізу вынікаў канстатуючага і кантрольнага эксперыментаў, удакладненне тэарэтычных і практычных высноў, пацвярджэнне дакладнасці, доказнасці тэарэтычных палажэнняў і апрабаваных метадычных рэкамендацый для маладых педагогаў.

На ўсіх этапах эксперымента вядучым выступаў сістэмна-дзейнасны крытэрый ацэньвання, у адпаведнасці з якім выпрацоўваліся паказчыкі, адаптаваныя непасрэдна да нашага даследавання. Неабходна патлумачыць выбар дзейнаснага крытэрыю ў якасці прыярытэтнага. Як вядома, сістэмна-дзейнасны падыход пры арганізацыі адукацыйнага працэсу арыентаваны на "разнастайныя віды дзейнасці, на вучня як суб'екта навучання і выхавання. Пры гэтым дзейнасць навучэнца з'яўляецца асновай, сродкам і ўмовай развіцця яго асобы" [3, с. 7]. У кантэксце сістэмна-дзейнаснага падыходу паказчыкамі ўзроўню сфарміраванасці навыкаў правапісу слоўнікавых слоў на ўроках беларускай мовы выступалі наступныя ўменні: правільнае напісанне слоўнікавых слоў, арфаграфічная пільнасць

навучэнцаў (уменне “бачыць”, распазнаваць арфаграмы на слых у вусным маўленні і пры пісьме), уменне самакантраляваць напісанае). Дыдактычным матэрыялам для правядзення педагагічнага эксперымента выступалі арфаграфічная дыктоўка, а таксама тэкст з памылкамі, у якім трэба было выправіць няправільныя напісанні. Выкарыстоўвалася дыягнастычная методыка ацэнкі вывучаных арфаграм Н.У. Зайцава.

З дапамогай заданняў канстатуючага эксперымента было выяўлена: узровень арфаграфічных ведаў і ўменняў навучэнцаў невысокі. Прычынамі недастатковага валодання арфаграфіяй з'яўляюцца: няведанне правіл і няўменне іх прымяняць, незасваенне арфаграфічных алгарытмаў, няўважлівасць навучэнцаў, адсутнасць навыкаў арфаграфічнай пільнасці, нізкая матывацыя да вучобы ў некаторых вучняў, адсутнасць дапамогі і кантролю за паспяховасцю дзяцей з боку асобных бацькоў.

На фарміруючым этапе эксперымента выкарыстоўвалася сістэма метадаў і прыёмаў: каменціраванае пісьмо, арфаграфічнае прагаворванне, зрокавая дыктоўка, графічнае абазначэнне арфаграм, дыктоўка з самаправеркай, мадэляванне маўленчых сітуацый, гульнёвыя заданні і інш. Эфектыўны прыём – суправаджэнне слоўнікавай працы дадатковамі малюнкамі, ілюстрацыямі, прэзентацыямі, структураванымі па формуле слоўнікавае слова $\rightarrow$ словазлучэнне з ім$\rightarrow$ сказ $\rightarrow$ тэкст. Фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення слоўнікавых слоў забяспечваецца сістэматычнай працай з тэкстамі, што ўключаюць гэтыя адзінкі. З мэтай пашырэння слоўнікавага запасу вучняў можа праводзіцца работа з устойлівымі выразамі.

Паслядоўнасць працы з новым слоўнікавым словам можа быць наступнай. Безумоўна, варта пачынаць працу з літаратурнага вымаўлення і арфаграфічнага вобліку слова. Пры засваенні значэння варта прадугледзець мнагазначнасць слова. Напрыклад, трэба нагадаць навучэнцам, што слова бібліятэка мае не толькі значэнне ′ўстанова, якая збірае і захоўвае кнігі для грамадскага карыстання′, але і ′збор кніг, якія з’яўляюцца прыватнай або грамадскай уласнасцю, а таксама памяшканне, дзе яны захоўваюцца′ (бібліятэка даследчыка), а таксама ′назва серыі кніг пэўнай тэматыкі ′ (бібліятэка настаўніка беларускай мовы). Дарэчным кампанентам слоўнікавай працы будзе падбор слоў-сваякоў (аднакаранёвых, сінонімаў, прыдумванне пэўных апор, асацыятыўных радоў (напрыклад, біблiЯ, экзэмпляры якой захоўваюцца ў бібліятэцы) [2, с. 54]. Так. знаёмства са слоўнікавым словам аб’язджаць (4 клас) патрабуе не толькі працы з тлумачальным слоўнікам (высвятленне лексічнага значэння адзінкі), з арфаэпічным даведнікам [абйажджаць], але і падбору аднакаранёвых слоў (пад’язджаць, з’язджаць, выязджаць, пераязджаць, аб’езд), запісу словазлучэнняў (аб’язджаць ямы, аб’язджаць палі′, пераязджаць з месца на месца і інш.), прыдумванне, прывядзенне прыкладаў-сказаў: Леснікам прыходзіцца аб’язджаць вялікія тэрыторыі. Лагтчнымі будуць пошукі загадак/адгадак з гэтым словам (Што можа аб’язджаць увесь свет, не пакідаючы свайго кутка? – Паштовая марка). Дапаўняюць сям’ю слоўнікавага слова ўрыўкі з паэтычных/публіцыстычных твораў: Еду ў госці міма Віці, міма Каці, еду я на самакаце. Аб’язджаю ямкі, горкі – еду ў госці да Ягоркі [1, с. 52].

У “класічны” набор прыёмаў працы са слоўнікавымі словамі даследчыкі раяць далучаць такія нестандартныя заданні, якія фарміруюць у навучэнцаў станоўчую матывацыю да вывучэння роднай мовы, спрыяюць таму, каб вывучэнне такіх слоў станавілася цікавым і запамінальным: прачытайце тэкст, дапоўніце яго слоўнікавымі словамі, перакладзіце словы з рускай мовы на беларускую, дапоўніце загадку патрэбнымі словамі і адгадайце яе, разгадайце рэбус, запоўніце крыжаванку, злучыце лініяй слоўнікавыя словы з іх значэннем, прачытайце словы, якія “схаваліся” ў прапанаваных слоўнікавых словах, знайдзіце слоўнікавыя словы ў скорагаворках /прыказках/ народных прыметах/вершах/загадках, падпішыце малюнкі слоўнікавымі словамі, правядзіце самаацэнку напісанага і інш [4].

Асобным кампанентам слоўнікавай працы варта выдзеліць лексікаграфічную састаўную, абумоўленую ўменнем вучняў працаваць з арфаграфічнымі даведнікамі. Слоўнікі – як у традыцыйна-папяровым, так і ў электронным выглядзе – адыгрываюць асаблівую ролю: яны дэманструюць як літаратурную норму, так і багацце, прыгажосць мовы, дапамагаюць спасцігнуць таямніцы моўных заканамернасцей, паглыбляюць лінгвістычныя веды, развіваюць цікавасць і любоў да роднай мовы. Слоўнікі дапамагаюць навучэнцам ажыццяўляць кантроль і самакантроль у працэсе засваення

слоўнікавых слоў. Больш таго, уменне карыстацца рознымі даведнікамі з’яўляецца метапрадметным, значымым для працы па ўсіх школьных дысцыплінах.

На камбінаваных уроках мы выкарыстоўвалі падчас каментаванага пісьма арфаграфічны разбор слоў, сказаў. Каментаванае пісьмо будуецца на аснове прагаворвання па складах, мы ж прапаноўвалі навучэнцам не проста прагаворваць прапанаваныя словы і сказы, але абгрунтоўваць іх напісанне правіламі, падборам праверачных слоў. Ацэньванне праводзілася па тых жа крытэрыях і паказчыках, што і ў пачатку даследавання з розніцай у заданнях, якія адпавядаюць патрабаванням для навучэнцаў 4 класа да канца навучальнага года.

**Заключэнне.** Аналіз літаратуры па тэме даследавання, вынікі вопытна-эксперыментальнай працы дазваляюць зрабіць наступныя высновы. Сістэматычнае выкарыстанне спецыяльных практыкаванняў спрыяе павышэнню якасці арфаграфічных навыкаў навучэнцаў. Важным складнікам дзейнасці з’яўляецца не толькі пісьмовая, але і вусная праца па запамінанні графічнага вобліку слова. У эксперыментальнай групе вырасла арфаграфічная пільнасць навучэнцаў, папоўніўся іх слоўнікавы запас, з'явілася цікавасць да ўрокаў беларускай мовы, ведання арфаграфічных правіл.

Падчас эксперыментальнай працы было заўважана, што навучэнцы сталі больш упэўненымі ў напісанні слоўнікавых слоў, сталі хутчэй падбіраць праверачныя словы. Вучні ўмеюць “бачыць” арфаграмы, абгрунтоўваць правапіс слоў, разгорнута каменціраваць іх, пры гэтым выкарыстоўваюць як вуснае, так і пісьмовае каменціраванне, распазнаюць і падкрэсліваюць арфаграмы ўмоўнымі абазначэннямі.

Варта адзначыць, што трываласць развіцця арфаграфічных навыкаў знаходзіцца ў прамой і непасрэднай залежнасці ад агульнага маўленчага ўзроўню навучэнцаў. Адпаведна неабходна надаваць належнае развіццю маўленча-камунікатыўных і ўніверсальных здольнасцей навучэнцаў – назіральнасці, увагі, памяці, уменняў аналізаваць, класіфікаваць, супастаўляць, параўноўваць, асэнсавана чытаць.

1. Мітраховіч, А.Л. Вывучаем слоўнікавыя словы ў II – IV класах / А.Л. Мітраховіч // Пачатковая школа. – 2024. – № 4. – С. 51 – 52.

2. Няборская, Н.В. Сістэма работы па вывучэнні слоўнікавых слоў/ Н.В. Няборская // Пачатковая школа. – 2014. – № 6. – С. 54 – 60.

3. Образовательные стандарты общего среднего образования [Электронный ресурс] : утв. постановлением Министерства образования Республики Беларусь, 26.12.2018 № 125. – Режим доступа: https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. – С. 1–192. – Дата доступа: 04.09.2025.

4. Свірыдзенка, В. І. Слоўнікавыя словы: дапам. для вучняў / В.І. Свірыдзенка, Н.М. Антановіч. – Мінск: Пачатковая школа, 2016. – 72 с.

## ВНЕУЧЕБНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ СТУДЕНТОВ: СУЩНОСТЬ ПОНЯТИЯ

***Салтанова О.Ю.***,
*студентка 4 курса ВГУ имени П.М. Машерова. г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Денисова И.В., канд. пед. наук*

Ключевые слова. Внеучебная деятельность студентов, понятие внеучебной деятельности, профессиональная подготовка, образовательный процесс.

Keywords. Students' extracurricular activities, the concept of extracurricular activities, professional training, and the educational process.

Глобальные изменения в социальной и профессиональной сфере Республики Беларусь заставляют постоянно совершенствовать систему высшего образования. Введение новых образовательных стандартов высшего образования поставило перед вузами задачу освоить подходы в области воспитания и обучения студентов в соответствии с актуальным требованием времени [1].

Специфика высшего образования сегодня – создание компетентностной модели выпускника с набором ведущих компетенций, реально формируемых в конкретном образовательном учреждении. Однако только общепрофессиональные и профессиональные компетенции студентов не могут характеризовать качество профессиональной подготовки. Приобретаемые студентами в учебной деятельности умения и навыки